Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманні ў Беларусі працягваюцца 20 і 21 чэрвеня (абнаўляецца)

дапоўнена

22.06.2020 **Тэгі**: рэпрэсіі, затрыманні



Аўтазак знутры. Фота аднаго з затрыманых з Барысава

20 чэрвеня людзі стыхійна выходзяць на вуліцы горада. Ёсць затрыманні. Інфармацыя абнаўляецца.

Як паведамляе "Радыё Свабода", каля крамы "Цэнтральны" (Мінск) супрацоўнікі ў цывільным затрымалі і пасадзілі ў бусік двух чалавек, якія замаўлялі каву. У аднаго з іх на заплечніку быў бел-чырвона-белы сцяжок.



Па звестках праваабарончага цэнтра "Вясна", на дадзены момант затрыманы:

Мінск

- **Сушчынскі Дзмітрый**
- **Таранда Уладзіслаў -** аштрафаваны.
- **Хацкевіч Арцём** - аштрафаваны.
- **Канановіч Аляксандр** з Салігорску. Яго жонка паведаміла "Вясне", што сёння яе муж прыехаў у Мінск і з 19 гадзін недасяжны. Прыкладна ў 23 ён выйшаў на сувязь: яго затрымалі, даставілі ў РУУС Савецкага раёна, але затым адпусцілі.
- **Крыварот Андрэй** з Гродна. Затрыманы АМАПам, дастаўлены ў Ленінскае РУУС. Зараз на ІЧУ - аштрафаваны.
- **Кузьміч Леанід,** Мінск, затрыманы каля пл. Незалежнасці. суд 22 чэрвеня ў судзе Савецкага раёна - аштрафаваны.
- **Дзяніс Адаміч**

Ганцавічы

Каля двух дзясяткаў чалавек выйшлі на ланцуг салідарнасці. Па звестках журналіста "Ганцавіцкага часу", які веў стрым, затрымана ня менш за 10 чалавек з выкарыстаннем грубай фізічнай сілы. Кіраваў апэрацыяй падпалкоўнік міліцыі **Віталь Куляшоў.**



Скрын са стрыму "Ганцавіцкага часу"

Сярод затрыманых — **Ігар Дулік** (ён збіты) і **Алла Калесніковіч.**

Услед за гэтым двух журналістаў "Ганцавіцкага часу", якія вялі стрым, таксама затрымалі: **Сяргея Багрова** і **Аляксандра Пазняка.** Іх збілі — падрабязнасці тут.

Барысаў

- **Гордзіеўскі Дзмітрый** - вызвалены
- **Шапчыц Юрый** (затрыманы разам з роварам) - вызвалены
- **Хадасевіч Барыс** - у ізалятары да суда
- **Самсонаў Іван** - вызвалена
- **Самсонава Святлана** - вызвалена
- **Шувалаў Дзмітрый -** у ізалятары да суда

- **Шувалава Марына** - вызвалена
- **Маркіянчык Дзмітрый** - вызвалены
- яшчэ адзін мужчына

Некаторых затрыманых вызвалілі. Інфамацыя ўдакладняецца.

Гродна

- **Амплееў Яўген** (сябра ініцыятыўнай групы Святланы Ціханоўскай) - паведамляюць naviny.by

Брэст

- **Сухаў Дзмітрый**
- **Сухаў Пётр**
- **Каховіч Раман** - вызвалены
- **Мароз Дзмітрый** - вызвалены
- **Грыцук Уладзіслаў** - вызвалены

Наваполацк

Прама на працоўным месцы затрыманы **Дзмітрый Рыжычэнка**. На яго складзены пратакол па ч. 1, арт. 23.34 (парушэнне правілаў правядзення масавых мерапрыемстваў). Да суда, які адбудзецца ў 11.00 22 чэрвеня, хлопца пакінулі ў ізалятары.

Салігорск

Сябра ініцыятыўнай групы Святланы Ціханоўскай **Уладзіміра Кучынскага** затрымалі на працоўным месцы - ў салігорскай шахце.

Зранку затрымалі сябра рады моладзі Руху "За Свабоду" **Рамана Сталбунова**. Імаверная прычына затрымання - запрашэнне жыхароў Салігорску на каву ў Парк чатырох стыхіяў. Суд адбудзецца ў 12.30 у судзе Салігорскага раёну.

Затрыманні працягнуліся і ў нядзелю 21 чэрвеня

У **Віцебску** былі затрыманы **Аляксандр Войтаў і Ірына Трацьякова**. Абодвух адпусцілі пасля складання пратаколаў па арт. 23.34 КаАП.



Кармленне галубоў па-віцебску: затрыманне і пратакол

Жыхар Віцебска Аляксандр Вайтоў 21 чэрвеня выйшаў на цэнтральную плошчу абласнога цэнтра на акцыю, вядомую як "кармаленне галубоў". Праз хуткі час яго затрымалі супрацоўнікі міліцыі і даставілі ў аддзяленне.

У **Навагрудку** сёння на ланцугу салідарнасці ў цэнтры горада затрымалі каля 5 чалавек. Затрыманы **Алег Аляшкевіч, Андрэй Акупінскі, Сяргей Казак, Аляксандр Камісараў, Печка Сяргей, Печка Алена.** Іх адвезлі ў мясцовы РАУС, складаюць пратаколы па арт. 23.4 КаАП.



Спіс затрыманых падчас мірных акцый 19 чэрвеня

Апошні дзень збору подпісаў за альтэрнатыўных вылучэнцаў у кандыдаты скончыўся стыхійнымі акцыямі па ўсёй краіне. Падчас акцый у розных гарадах краіны адбыліся затрыманні. "Вясна" складае спіс затрыманых.

Твитнуть




Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА
"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

"Не ядзернай зброі ў Беларусі!". Як прайшоў "Чарнобыльскі шлях" у Варшаве. ШМАТ ФОТА

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі" – вясноўцы на акцыі ў Вільні

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ



ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

